***Раїса Зянюк,***

***малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі.***

# РОЛЯ ВЫПУСКНІКОЎ КАТАЛІЦКІХ ДУХОЎНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ У КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІМ ЖЫЦЦІ ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯЎ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў КАНЦЫ XVIII–XIX СТ.

Досліджено діяльність католицького духовенства у культурно-освітньому житті західних губерній Російської імперії в кінці XVIII–XIX ст., визначаються основні напрямки культури й освіти, в яких найбільшу роль відіграли випускники католицьких духовних навчальних закладів.

***Ключові слова:*** *Російська імперія, католицький духовний навчальний заклад, Католицька церква, римсько-католицьке духовенство, унійне духовенство, культура та освіта.*

Перыяд з канца XVIII–XIX ст. з'яўляецца часам сур'ёзных зменаў у рэлігійнай сітуацыі беларуска-літоўскіх і ўкраінскіх земляў. Каталіцкая царква, абмежаваная знешнімі фактарамі (расійскім заканадаўствам, пастановамі дзяржаўнай улады), паступова губляла сваю ўплывовасць і дамінацыю ў культурна-рэлігійным, палітычным і гаспадарчым жыцці. Негледзячы на знешнія абмежаванні, значная частка каталіцкага духавенства актыўна ўключалася ў культурнае жыццё свайго краю. Выпускнікі духоўных навучальных устаноў займаліся адукацыйнай, літаратурнай, мастацкай, музычнай дзейнасцю.

Гістарыяграфія пытання прадстаўлена даследаванямі біяграфічнага характару і мемуарнай літаратурай[1], вывучэннем гісторыі духоўных навучальных устаноў[2], а таксама даследаваннямі гісторыі культуры і адукацыі[3]. Ува ўсіх комплексных даследаваннях каталіцкія дзеячы разглядаюцца як часткі агульнай культурнай супольнасці.

Да духоўных навучальных установаў залічваюцца тыя, у якіх адукацыю атрымлівала духавенства – семінарыі, студыя манаскія, акадэміі. На беларуска-літоўскіх і ўкраінскіх землях у перыяд з 1788 па 1803 існавала 11 семінарыяў, да 1820 г. іх колькасць павялічылася да 14. Рост колькасці семінарыяў спыніўся ў 1830 г., а ўжо ў 1844 г. на тэрыторыі заходніх губерняў засталося толькі 5 духоўных семінарыяў (у Вільні, Мінску, Ворнях, Жытоміры і Камянцы Падольскім)[4]. Чарговыя змены наступілі ў 1869 г., калі была закрыта Мінская семінарыя. Манаскае духавенства атрымлівала адукацыю ва ўласных навучальных установах – студыях манаскіх, хоць існавала магчымасць і навучання ў семінарыях[5]. Вышэйшую тэалагічную адукацыю давалі Галоўная семінарыя ў Вільні (1803–1832), Полацкая езуіцкая акадэмія (1812–1820), Духоўная акадэмія ў Вільні (1833–1842) і Пецярбургу (1842–1918). Духоўныя навучальныя ўстановы не давалі спецыяльных ведаў у галіне педагогікі, літаратуры, мастацтва. У той жа час сярод іх выпускнікоў былі людзі, якія актыўна дзейнічалі ў азначаных галінах.

Сярод заангажаваных у культурна-асветніцкую дзейнасць выпускнікоў каталіцкіх духоўных навучальных установ пераважная большасць працавала не толькі ў рэлігійнай сферы дзейнасці, але таксама ў сферы адукацыі і навукі. Скончыўшыя навучанне ў семінарыях і акадэміях святары працягвалі сваю працу ў якасці выкладчыкаў і рэктараў духоўных семінарыяў і вышэйшых научальных установ, выкладчыкаў ў парафіяльных школах, прэфектаў школ, настаўнікаў Закона Божага ў свецкіх школах. Працаўнікі духоўных вышэйшых навучальных установ акрамя выкладчыцкай, займаліся і навуковай дзейнасцю, перадусім ў галіне філасофіі і тэалогіі. Так, сярод 263 навучэнцаў Галоўнай семінарыі (католікаў і уніятаў) пасля заканчэння вучобы педагагічнай дзейнасцю ў духоўных семінарыях і вышэйшых научальных установ працягваў займацца 41 (15,6 %) чалавек, 11 (4,1 %) – атрымалі пасады рэктараў і рэгенсаў семінарыяў. Сярод іх рэгенсаў рымска-каталіцкіх семінарыяў – 9, грэка-каталіцкіх – 1, праваслаўных – 1. 5 чалавек (2 %) займаліся выкладчыцкай дзейнасцю ў свецкіх вышэйшых навучальных установах (Віленскім і Кіеўскім універсітэтах), а 22 (8,3 %) працавалі на пасадах настаўнікаў у школах, навучаючы не толькі Закону Божаму, але і іншым прадметам, напрыклад, польскай мове[6]. Так, прафесарам Віленскага універсітэта быў выпускнік Галоўнай семінарыі ксёндз Міхал Баброўскі, грэка-каталік. Выкладчыцкую дзейнасць ва ўніверсітэце ён распачаў ў 1814 г. на кафедры Св. Пісання. Акрамя тэалагічных дысцыплін ён выкладаў філалагічныя: стара-царкоўнаславянскую мову. Быў выбітным навукоўцам у галіне філалогіі, тэалогіі, археалогіі[7].

Найбольш папулярнай галіной дзейнасці, у якой рэалізаваліся выпускнікі духоўных навучальных установаў, была літаратура і філалогія (мовазнаўства). Значная частка святароў у той ці іншай ступені займалася літаратурнай дзейнасцю, многія таксама публікавалі свае творы на старонках тагачасных газет і часопісаў. Так, сярод выпускнікоў Галоўнай семінарыі быў ксёндз Плацыд Янкоўскі, ураджэнец Брэсцкага павету, вядомы літаратар, які пісаў пад псеўданімам *John of Dycalp*[8]. У Літве і Беларусі аўтар быў вядомы дзякуючы папулярным аповесцям, апавяданням, анекдотам, перакладам з нямецкай і італьянскай моваў[9], успамінам аб Галоўнай семінарыі[10]. Плацыд Янкоўскі быў адным з першых, хто перакладаў на польскую мову У. Шэкспіра. Акрамя сваёй літаратурнай дзейнасці, П. Янкоўскі вядомы як адзін з ліквідатараў Уніяцкай царквы на Беларусі. У 1837 г. прыняў праваслаўе, а ў 1839 г. быў сярод падпісаўшых акт ліквідацыі уніі. Пасля 1863 г. пісаў выключна па-руску[11].

Навучэнец семінарыі ў Камянцы Падольскім і духоўнай акадэміі ў Санкт Пецярбургу Караль Недзялкоўскі (1846–1911) таксама быў вядомы як цікавы пісьменнік, эрудыт і палеміст, якога цяжка было перамагчы. Апрача вялікай колькасці артыкулаў у часопісах «Rola», «Gios katolicki» і іншых выдаў шэраг асобных прац[12]. Літаратурная дзейнасць ксяндза Недзялкоўскага не была яго асноўным заняткам: у перыяд з 1872–1883 ён працаваў на пасадзе сакратара рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі, пасля – прафесара семінарыі, з 1897 г. – рэктара Духоўнай акадэміі, пазней атрымаў пасаду біскупа-суфрагана Магілёўскага і біскупа Луцка-Жытомірскага.

Навучэнец Луцкай духоўнай семінарыі і Духоўнай акадэміі ў Вільні Ігнацый Галавінскі дзейнасць сваю распачаў як капелан шляхецкай школы ў Жытоміры, праз некалькі год стаў канонікам катэдральным у Жытоміры, прафесарам рэлігіі і капеланам Кіеўскага універсітэта. Актыўна займаўся літаратурнай і перакладчыцкай дзейнасцю. У 1836 г. выдаў паэму «Дзіцятка Езус». Падчас працы ў Кіеўскім універсітэце пераклаў на польскую мову творы У. Шэкспіра. Пераклад быў надрукаваны ў Вільні ў 1840 г. пад псеўданімам Кефаліньскага. Сярод перакладчыцкай спадчыны ксяндза Галавінскага важнае месца займаюць «Санеты» Петраркі. Пасля закрыцця Кіеўскага універсітэта наведаў Св. Зямлю, падарожжа апісаў у форме лістоў да брата і выдаў у Пецярбургу ў 1853 г.[13] З 1842 г. працаваў на пасадзе рэктара Духоўнай акадэміі ў Пецярбургу, але працягваў займацца літаратурнай творчасцю. Так, у 1843 г. у Вільні выйшлі яго «Легенды» – збор аповесцяў, узятых з Бібліі, гісторыі касцёла і краю, «Тэчкі рознасцяў», сярод якіх «Жыццё маёй маці». Друкаваўся ў «Tygodniku Petersburskim» (№ 18–53 за 1846 г.). Ксяндзом Галавінскім было зроблена падрабязнае апісанне 7 дыяцэзій імперыі (у 7 тамах), якія з'яўляюцца важным матэрыялам да гісторыі каталіцкага касцёла у Расійскай імперыі. Пасля яго смерці ў 1855 г. у Кракаве выйшаў яго падручнік па гамілетыцы[14] і збор пропаведзяў[15].

Паэтам, драматургам, гісторыкам і тэолагам быў езуіт Нікадэм Мусніцкі (1765–1805), навучэнец езуіцкіх школаў, які паходзіў з беларускіх земляў. Найбольшую вядомасць здабыў у сувязі з напісаннем хвалебных вершаў, якія былі прысвечаны расійскім імператарам. Да найбольш выбітных яго твораў належыць «Палтава. Эпічная паэма», у якой аўтар апісвае перамогі Пятра І над Карлам ХІІ падчас шведскай вайны[16].

Папулярным накірункам дзейнасці сярод выпускнікоў семінарыяў і акадэміі была філалогія і моваэнаўства. Каталіцкія святары, якія працавалі ў заходніх губернях Расійскай імперыі, часта дасканала вывучалі мову карэннага насельніцтва і стараліся пашыраць яе веданне ў імперыі. Так, Тамаш Касоўскі, выпускнік Краслаўскай духоўнай семінарыі, быў аўтарам адной з першых граматык высокалітоўскай гаворкі. Латышскую мову Т. Касоўскі вывучыў у семінарыі, дзе навучаўся з 1818 г. Пасля закрыцця Краслаўскай семінарыі (у 1843 г.), у якой Т. Касоўскі працаваў на пасадзе правізара, ён склаў інфлянцка-латышскую граматыку («Gramatyka inflancko-łotewska dla uczących się języka łotewskiego», выдадзеная ў Рызе ў 1853 г.). Асноўным яе прызначэннем было даць веды святарам, якія працуюць на латвійскіх землях і не ведаюць латышскай мовы. Т. Касоўскі з'яўляўся таксама аўтарам «Казанняў на ўсе нядзелі году», напісанай па латышску. Дзейнасць ксяндза Касоўскага не абмяжоўвалася рэлігійнай дзейнасцю і навукай. Ён з'яўляўся фундатарам і заснавацелем сялянскай школы ў Ліксне, дзе працаваў плябанам. Некаторы час ксёндз Касоўскі кіраваў гэтай школай, а таксама аплачываў навучанне 10 самых бедных дзяцей[17]. Навучэнцам Краслаўскай духоўнай семінарыі быў таксама моваэнавец ксёндз Ян Курмін, аўтар польска-лацінска-латышскага слоўніка[18].

У галіне моваэнаўства працаваў таксама выпускнік Галоўнай семінарыі кс. Ян Хрызастом Гінтыла, пазнейшы выкладчык Біблії ў Віленскім універсітэце. Ён

жа з'яўляўся аўтарам яўрэйска-польскага слоўніка (не выдадзенага падчас жыцця даследчыка)[19].

Вывучэнне мовы насельніцтва абумоўлівала таксама захапленне часткі каталіцкага духавенства фальклорам і этнаграфіяй. Гэта, ў сваю чаргу, выклікала цікавасць да народнай культуры з боку даследчыкаў. Так, навучэнец Віленскай духоўнай семінарыі і Духоўнай акадэміі ў Вільні ксёндз Людвік Юцэвіч на пачатку сваёй дзейнасці займаўся перакладамі на польскую мову пераважна расійскіх аўтараў («Piśma Ludwika Adama Jucewicza», выдадзены ў Вільні ў 1834 г.). Але пазней зацікавіўся этнаграфіяй і выдаў некалькі артыкулаў аб літоўскіх звычаях і абрадах, легендах, літоўскіх пісьменніках і літоўскай літаратуры[20]. Л. Юцэвіч склаў бібліяграфічны даведнік аб вучоных-літоўцах (жмудзінах), у якім утрымліваліся звесткі аб 184 літоўскіх асветніках і літаратарах. Гэтая праца, аднак, была надрукавана толькі ў другой палове XX ст. Займаўся перакладамі на літоўскую мову, друкаваў у рускамоўных часопісах артыкулы па літоўскай міфалогіі і этнаграфіі[21]. Украінскі фальклор даследаваў ксёндз Эразм Ізапольскі (1812 – пасля 1862), выпускнік Магілёўскай духоўнай семінарыі[22]. Пасля яе заканчэння (1842) быў прызначаны на пасаду вікарыя ў Белую Царкву, дзе праз некаторы час стаў пробашчам. Малады святар меў выразную ўкраінскую самасвядомасць. Украінскім фальклорам, па адзначэнні даследчыкаў, цікавіўся яшчэ з ранняй маладосці. Ужо тады Э. Ізапольскі займаўся зборам тэстаў народных украінскіх песняў і апісаннем неакаторых рэгіёнаў Украіны. Яшчэ ў 1835 г. у «Tygodniku Petersburskim» былі апублікаваны ўрыўкі са збораў «Песні украінца». Пасля заканчэння навучання ў семінарыі вынікі сваіх даследаванняў пад псеўданімам Белацаркоўскі Э. Ізапольскі друкаваў пераважна ў «Tygodniku Petersburskim», «Atheneum» Ю. Крашэўскага і іншых часопісах[23]. Украінскія тэксты падаваў альбо ў арыгінале, альбо ў арыгінале з перакладам на польскую мову, прычым на польскую перакладаў не заўсёды сам. Украінскія тэксты друкаваў лацінкай. Асобна выдаў «Duma z dum ukraińskich. Pieśni lirnika o ukraińskim kozactwie»[24].

Важную ролю ў культуры, навуцы і адукацыі адыгралі таксама выпускнікі манаскіх студыяў. Так, да ордэна піяраў належыў Анёл Доўгірд, які манаскія студыя скончыў у Любешаве. Настаўнічаў, навучаючы матэматыцы, рыторыцы, фізіцы ў Віцебску, Лужках і Шчучыне. Доўгі час выкладаў логіку і філасофію ў Віленскім універсітэце[25]. Членам таго ж ордэна піяраў быў Станіслаў Юндзіл, які таксама атрымаў адукацыю у піяраў у Лідзе і Любешаве[26] і быў вядомы як вучоны-батанік, заолаг. Езуіт Францішак Анджаліні займаўся гісторыяй і пакінуў пасля сябе ў рукапісе грунтоўную працу, прысвечаную гісторыі Таварыства Езуса ў Расіі. Філасофіяй займаліся езуіты Раймунд Бжазоўскі, Вінсэнт Бучынскі[27]. Дамініканец Фаўстын Цяцерскі, які працаваў у Забялах, Вільні, Ружанастоку, быў правінцыялам ордэна, а таксама візітатарам дамініканскіх школ на Літве. Яго дзённік быў надрукаваны па-руску ў 4 томе Археалагічнага зборніка пад назвай «Дневник визитатора Доминиканских монастырей Северо-Западного края» (выдадзены ў Вільні ў 1904 г.).

У значна большай ступені, чым выпускнікі дыяцэзіяльных семінарыяў, былі заангажаваны ў адукацыйную дзейнасць выпускнікі манаскіх студыяў. Звязана

гэта было з тым, што менавіта манаскія ордэны у перыяд з канца XVIII па 1830-я гг. ўтрымлівалі парафіяльныя і павятовыя школы для свецкіх, гімназіі, канвікты, музычныя школы і бурсы. У той жа час дзейнасць дыяцэзіяльнага духавенства ў галіне свецкай адукацыі зводзілася да выкладання Закону Божага ў школах і ўтрымання плябанамі парафіяльных школаў, дзе пасаду настаўніка ў большасці выпадкаў займаў спецыяльна наняты чалавек. Часам ў парафіяльнай школе настаўнічаў вікарый, арганіст альбо сам плябан[28] . Пачынаючы ад 40-х гг. XIX ст. роля каталіцкага духавенства ў адукацыйнай сферы сур'ёзна зменьшылася, і ў галіне свецкай адукацыі зводзілася толькі да выкладання Закону Божага прадстаўнікам рымска-каталіцкага веравызнання.

Акрамя іерархаў Каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыі, духоўныя навучальныя ўстановы падрыхтавалі уніяцкіх дзеячоў, якія, у далейшым, садзейнічалі скасаванню Уніяцкай царквы. Так, дыпломы Полацкай езуіцкай акадэміі атрымалі будучыя ліквідатары Уніі на беларускіх землях – Васіль Лужынскі і Антоні Зубко[29] . Яны ж навучаліся і ў Галоўнай семінарыі ў Вільні: В. Лужынскі – ў перыяд з 1816 па 1820 г., а Антоні Зубко – з 1818 па 1822 г. Галоўная семінарыя пры Віленскім універсітэце была *alma mater* і Іосіфа Сямашкі, ураджэнца Украіны, які скончыў яе ў 1820 г.

Каталіцкае духавенства спрычынілася таксама і да развіцця і пашырэння друку ў заходніх губернях Расійскай імперыі. Так, друкарня існавала пры кляштары Полацкіх езуітаў, дзе, акрамя кнігаў і падручнікаў для патрэбаў Полацкага калегіўма і акадэміі, выдаваўся адзін з першых часопісаў на беларускіх землях «Miesięcznik Połocki». Друкарня была заснавана ў 1787 г. па спецыяльным указе Кацярыны II. Пасля адкрыцця Полацкай акадэміі друкарня была падпарадкавана яе патрэбам і поўнасцю забяспечвала патрэбы ў падручніках і малітоўніках не толькі акадэміі, але і ўсіх школ, якія ад яе залежалі. Акрамя вучэбных і дыдактычных матэрыялаў, з друкарні выходзілі кнігі папулярных у той час аўтараў (Я. Каханоўскі, І. Красіцкі і інш.), творы членаў ордэна езуітаў (напр., П. Скаргі). Ініцыятыва выдання ўжо згаданага часопіса «Miesięcznik Połocki» належыла езуіту ксяндзу Раймунду Бжазоўскаму[30] . Яшчэ адну вялікую друкарню ўтрымлівалі віленскія ксяндзы з Кангрэгацыі Місіі. Іх друкарня, акрамя забеспячэння патрэбаў Віленскай кансісторыі, таксама выдавала значную колькасць падручнікаў для духоўных семінарыяў. Так, у Віленскай друкарні былі выдадзены падручнікі для клерыкаў аўтарства А. Поля «Institutiones Theologiae Dogmaticae et moralis ad usum Ecclesiasticorum impressae» (выдадзены ў Вільні ў 1809–1810), Scriptura Sacra per quaestiones exposita, responsionibus explicata, contra incredulos defensa (выдадзены ў Вільні ў 1810–1812), Rubricae breviarii et Missalis romani, iuksta decreta Sacrae Rituum Congregationis, mentemque gravisimorum in re liturgica authorum dilucida methodo explicatae, atque opportunis nimadversionibus illustratae impressum (выдадзены ў Вільні ў 1821) і іншыя[31] .

Сярод выпускнікоў духоўных навучальных устаноў былі і тыя асобы, якія пасля заканчэння навучання не прымалі пасвечанняў (па розных прычынах), альбо ад пачатку навучаліся як асобы свецкія (напрыклад, у Полацкай езуіцкай

акадэміі). Выпускнікамі Полацкай акадэміі былі літаратары У. Кейноўскі, Тамаш і Юзаф Массальскія, Ян Баршчэўскі, гісторык Лявон Патоцкі[32]. Выхаванцамі езуіцкіх навучальных установаў былі таксама: К. Тышкевіч, адзін з заснавальнікаў беларускай археалогіі; Ф. Талстой, рускі скульптар, медальер, віцэ-прэзідэнт Акадэміі Мастацтваў; мастак В. Ваньковіч; астраном Я. Накцыяновіч. Выхаванец езуітаў Я. Баршчэўскі быў адным з заснавальнікаў першага гуртка беларусістаў у Санкт-Пецярбургу ў (1820-я–1840-я гады)[33].

Такім чынам, акрамя непасрэдна рэлігійнай дзейнасці, выпускнікі каталіцкіх духоўных навучальных установаў актыўна дзейнічалі на ніве адукацыі, літаратуры, мастацтва і навукі. Выпускнікоў духоўных навучальных установаў адрознівала спалучэнне (часта вымушанае) некалькіх відаў дзейнасці: абавязковай рэлігійнай, выкладчыцкай і навуковай, альбо рэлігійнай, выкладчыцкай і літаратурнай. Асаблівасцю літаратурнай дзейнасці каталіцкіх святароў з'яўлялася выкарыстанне імі ў творчасці польскай мовы. Некаторыя, аднак, друкавалі творы на мовах карэннага насельніцтва, сярод якога працавалі (літоўская, латышская, украінская).

У сферы навукі выпускнікі каталіцкіх духоўных навучальных установаў займаліся, перадусім, філасофіяй, тэалогіяй, мовазнаўствам. Сярод навукоўцаў сустракаліся, аднак, і прыродазнаўцы, батанікі, заолагі, хоць колькасць іх не была вялікай.

1 Charkiewicz W. Bez steru i busoli. Sylwetka ksiedza prof. Michala Bobrowskiego / W. Charkiewicz. – Wilno, 1929.; Ejusd. Placyd Jankowski (John of Dycalp). Życie i twórczość / W. Charkiewicz. – Wilno, 1928.; Feliński Z. Pamiętniki / Z. Feliński. – Warszawa, 2009.; Dobszewicz T. Wspomnienia z czasow ktore przezylem / T. Dobszewicz. – S. l. a. – 216 s.; Dębicki L. Portrety i sylwetki z XIX stulecia / L. Dębicki. – Kraków, 1905; Dobraczynski J. A to jest zwyciężca / J. Dobraczynski. – Warszawa: Instytut wydawniczy Pax, 1986. – 232 s.; Fajecki A. Biskupi z naszej Almy (Katalog biskupów z pośrod b. wychowanków Rz.–Kat. Akademii Petersburskiej od r. 1842–1918) (Przyczynek do dziejów Akademii) / A. Fajecki. – Warszawa, 1938; і інш.

2 Gocłowski T. Organizacja seminariów diecezjalnych prowadzonych przez Zgromadzenie Misji: praca licencjacka, pod kier. Ks. prof. A. Petraniego / T. Gocłowski. – Lublin, 1959.; Godlewski M. Z dziejow Rzymsko – Katolickiej Akademii Petersburskiej / M. Godlewski. – Warszawa, 1938; Grabczak P. Seminaria duchowne Łucko–Żytomirskiej diecezji 1798–1842 / P. Grabczak. – Biały Dunajec; Ostróg: Wołanie z Wolynia, 2006; Jogela V. Vilniaus Romas Kataliku Dvasine Akademija 1833–1842 metais: organizacija ir veikla / V. Jogela. – Vilnius: Eugrimas, 1997; Wodzianowska I. Rzymskokatolicka Akademia Duchowna w Petersburgu 1842–1918 / I. Wodzianowska. – Lublin: Towarzystwo Naukowe KUL, 2007; і інш.

3 Historia nauki polskiej, 1795–1862: w 6 t. / red. tomu Jerzy Michalski. – Wrocław; Warszawa; Kraków – Gdańsk, 1977. – T. 3; Погодин А. Виленский учебный округ 1803–1831 г. / А. Погодин. – Санкт-Петербург, 1901; Zasztowt L. Kresy 1832–1864. Szkolnictwo na ziemiach Litewskich i Ruskich dawnej Rzeczypospolitej / L. Zasztowt. – Warszawa : Wyd. Instytutu Historii Nauki PAN, 1997; Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / [Ткачоў А. М., Пасэ У. С., Сінькевіч Г. Р. і інш.]; пад рэд. М. А. Лазарука і інш. – Мінск: Народная Асвета, 1985.; і інш.

4 Grabczak P. Seminaria duchowne Łucko-Żytomirskiej diecezji 1798–1842 / P. Grabczak. – Biały Dunajec; Ostróg: Wołanie z Wolynia, 2006. – S. 89, 117; Banaszak M. Geneza seminariów duchownych w Polsce / M. Banaszak // Collectanea Theologica. – 1967. –

№ 37. – S. 123–136; Długosz T. Seminaria duchowne we wschodniej Polsce do 1880 r. / T. Dlugosz. – Lwów, 1935.

5 Przepis dla Seminarium Archidiecezji Mohylewskiej Łacinskiej, czyli Regula dla Seminarzystów // Monumenta Ecclesiastica Petropolitana / M. Godlewski. – S. Petersburg: Drukarnia A. Smilgo, 1906. – Cz. 2. – S. 5–16.

6 Worotyński W. Seminarjum Główne w Wilnie. Powstanie i pierwszy okres dziejów (1803–1816) / W. Worotyński. – Wilno, 1935. – S. 212–219; Ejusd. Seminarjum Główne w Wilnie. Drugi okres dziejów i zniesienie (1816–1833) / W. Worotyński. – Wilno, 1938.

7 Charkiewicz W. Bez steru i busoli…

8 Worotyński W. Seminarjum Główne w Wilnie. Drugi okres dziejów i zniesienie (1816–1833) – S. 266–267

9 Пар. напр.: John of Dycalp. Dydak i Jagusia // Atheneum. Pismo zbiorowe poświęcone historii, filozofii, literaturze, sztukom i t. d. / [wydawca J. I. Kraszewski]. – Wilno, 1845. – T. 2. – S. 170–172.

10 Jankowski P. Wileńskie seminarium Główne w roku 1826 / P. Jankowski // Alma Mater Vilnensis. – 1926. – № 4. – S. 22–25.

11 Charkiewicz W. Placyd Jankowski (John of Dycalp)…

12 Podręczna Encyklopedya Kościelna. – Warszawa, 1912. – T. 27–28. – S. 397.

13 Pielgrzymka do Ziemi Świętej przez Ignacego Hołowińskiego, Arcybiskupa Mohylewskiego Metropolity Wszech Rzymsko-Katolickich kościołów w Cesarstwie Rosyjskiem. – Petersburg: Nakładem B. M. Wolfa, 1853.

14 Podręczna Encyklopedya Kościelna. – Warszawa, 1908. – T. 15–16. – S. 336–337.

15 Kazania niedzielne, świętalne i przygodne oraz allokucye niane w Petersburgu przez ś. p. księdza Ignacego Hołowińskiego Najprzewielebniejszego Arcybiskupa Mohylewskiego, Metropolity Wszech Rzymski-Katolickich kościołów w Cesarstwie Rosyjskiem (wydanie pośmiertne). – Kraków, 1857.

16 Demkowicz A. Poezja białoruskich jezuitów / A. Demkowicz. – Kraków: Collegium Columbinum. – S. 100.

17 Kolbuszewski S. F. Kossowski Tomasz / S.F. Kolbuszewski // Polski Slownik biograficzny. – T. XIV. – S. 323–324.

18 Smora. Z przeszłości obydwóch zgromadzeń w zaborze Rossyjskim / [wyd i nakład ks. Misjonarzy] // Roczniki obydwóch zgromadzeń św. Wincentego a Paulo. – Kraków. – S. 324–348.

19 Bieliński J. Uniwersytet Wileński: w 3 t. / J. Bieliński. – Kraków, 1899–1900. – T. 3.

20 Historia litewska dla dzieci przez L. A. J. – Wilno, 1836; Jucewicz L. Przyslowia ludu litewskiego / Jucewicz L. – Wilno, 1837; і інш.

21 История литовской литератары. – Вильнюс: Vaga, 1977. – С. 21–22.

22 Directorium horarum ńanonicarum et missarum ad usum utriusqve cleri Archi-Diocesis Mohiloviensis in AD MDCCCXL¸I, Mohileviae, typis consistorii Romano-Catholici, Directorium horarum ńanonicarum et missarum ad usum utriusqve cleri Archi-Diocesis Mohiloviensis in AD MDCCCXL¸, Mohileviae, typis consistorii Romano-Catholici, Directorium horarum ńanonicarum et missarum ad usum utrisque cleri Archi-Diocesis Mohiloviensis in AD MDCCCXL, Mohileviae, typis consistorii Romano-Catholici // Нацыянальны гіістарычны архіў Беларусі (г. Мінск). (далей – НГАБМ. – Ф. 1781. – Воп. 28. – Спр. 322.

23 Пар. напр.: Śpiewy historyczne Ukrainy, zebrane przez E. Izopolskiego. Duma III o Janie Swigowskim. Duma IV o Bohdanku / [wzdawca J. I. Kraszewski]. // Atheneum. Pismo zbiorowe poświęcone historii, filozofii, literaturze, sztukom i t. d. – Wilno, 1844. – T. 2. –

S. 72–86; Badania podań ludu – Ukraina. Zabytki wyobrażeń pogańskich; Spiewy religijne chrzescjańskie; Wyobrażenia Ukraińców połączone z publicznemi obchodami religijnemi. – Zabawy. Przez E. Izpolskiego / [wzdawca J. I. Kraszewski] // Ibid. – Wilno, 1843. – T. 5. – S. 61–75; Badania podań ludu. Pamiątki Ukrainy. Przez E. Izopolskiego / [wzdawca J. I. Kraszewski] // Ibid, 1843. – T. 1. – S. 19–31; і інш.

24 Sierotwiński S. Izopolski Erazm / S. Sierotwiński // Polski Slownik biograficzny. – Wrocław; Warszawa; Kraków, 1963. – T. X. – S. 198; Historia nauki polskiej: w 6 t / red. Jerzy Michalski. – T. 3: 1795–1862. – Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1977. – S. 202.

25 Bieliński J. Uniwersytet Wileński…

26 Ibid. Historia nauki polskiej… – T. 3.

27 Giżycki J. Notatka o Akademii i szkołach Połockich / J. Giżycki. – Poznań: Drukiem i nakładem Jarosława Leitgebra, 1884. – S. 21.

28 НГАБМ. – Ф. 1781. – Воп. 27. – Спр. 256; Воп. 4. – Спр. 93; Воп. 2. – Спр. 4150; Воп. 26. – Спр. 139, 1396, 1404, 1409, 1452 і інш.

29 Charkiewicz W. Bez steru i busoli… – S. 48.

30 Demkowicz A. Poezja białoruskich jezuitów. – S. 91–94.

31 Gocłowski T. Organizacja seminariów diecezjalnych prowadzonych przez Zgromadzenie Misji. Praca licencjacka, pod kier. Ks. prof. A. Petraniego / T. Gocłowski. – Lublin, 1959; Літоўскі гістарычны архіў (г. Вільнюс). – Ф. 694 – Воп. 1. – Спр. 395, 422; Scheltz A. Józef Jakubowski, zolnierz i kaplan (1743–1814) / A. Scheltz. – Kraków, 1945.

32 Архіў Малапольскай правінцыі Таварыства Езуса ў Кракаве. – Sygn. 1027. – XV. – Арк. 218.

33 Катлярчук А. Жазэф дэ Мэстр і Тадэвуш Бжазоўскі і справе адкрыцця Полацкай езуіцкай акадэміі / Катлярчук А. – Режим доступа: www.epolotsk.com/page.php?al=alias3683.

**SUMMARY**

**Raisa Zianiuk**

THE ROLE OF GRADUATES OF CATHOLIC RELIGIOUS EDUCATIONAL ESTABLISHMENTS IN CULTURAL AND EDUCATIONAL LIFE OF THE WESTERN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE AT THE END OF XVIII–XIX CENTURIES

The article investigates the activities of the Catholic clergy in the cultural and educational life of the western provinces of the Russian Empire at the end of XVIII– XIX centuries. Determining the main directions of culture and education, in which graduates of Catholic religious schools have played the greatest role.

**Key words**: Russian Empire, the Catholic religious schools, Catholic Church, the Roman Catholic clergy, the Unitarian clergy, culture and education.